**Лаўрэаты прэмій імя акадэміка А.В.Лыкава 2014 года**

Пастановай Прэзідыума НАН Беларусі "Аб прысуджэнні прэмій імя акадэміка А.В.Лыкава 2014 года" ад 8 верасня 2014 г. № 57

міжнародная прэмія імя акадэміка А.В.Лыкава 2014 года прысуджана **за цыкл прац "Дынаміка і фарміраванне структур у плёначных плынях пры інтэнсіўным міжфазным абмене"** аўтарскаму калектыву ў складзе:

**Аляксеенка Сяргей Уладзіміравіч** - дырэктар Інстытута цеплафізікі імя С.С.Кутатэладзэ Сібірскага аддзялення Расійскай акадэміі навук, член-карэспандэнт Расійскай акадэміі навук, доктар фізіка-матэматычных навук;

**Марковіч Дзмітрый Маркавіч** - загадчык лабараторыі фізічных асноў энергетычных тэхналогій Інстытута цеплафізікі імя С.С.Кутатэладзэ Сібірскага аддзялення Расійскай акадэміі навук, член-карэспандэнт Расійскай акадэміі навук, доктар фізіка-матэматычных навук;

**Шарыпаў Алег Уладзіміравіч** - загадчык лабараторыі радыяцыйнага цеплаабмену Інстытута цеплафізікі імя С.С.Кутатэладзэ Сібірскага аддзялення Расійскай акадэміі навук, доктар фізіка-матэматычных навук;

прэмія імя акадэміка А.В.Лыкава 2014 года айчынным вучоным прысуджана за цыкл работ **"Узаемасувязь меза- і макраскапічных працэсаў пераносу ў нераўнаважных сістэмах з мікра- і нанаразмернымі структурамі (у тым ліку і біялагічнымі)"** аўтарскаму калектыву ў складзе:

**Кашэўскі Браніслаў Эдуардавіч** - вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі фізіка-хімічнай гідрадынамікі дзяржаўнай навуковай установы "Інстытут цепла- і масаабмену імя А.В.Лыкава Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі", доктар фізіка-матэматычных навук;

**Фісенка Сяргей Паўлавіч** - вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі тэорыі пераносу дзяржаўнай навуковай установы "Інстытут цепла- і масаабмену імя А.В.Лыкава Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі", доктар фізіка-матэматычных навук;

**Шніп Аляксандр Іванавіч** - загадчык лабараторыі тэорыі пераносу дзяржаўнай навуковай установы "Інстытут цепла- і масаабмену імя А.В.Лыкава Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі", кандыдат фізіка-матэматычных навук.